***М.А. Шапель***
БГЭУ (Минск)

# АПОШНІ КАРОЛЬ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА СТАНІСЛАЎ АЎГУСТ ПАНЯТОЎСКІ

Станіслаў Аўгуст зарэкамендаваў сябе ў якасці рэфарматара. Яшчэ на канвакацыйным сойме 1764 г. групоўка пад назвай "фамілія", прадстаўніком якой быў Панятоўскі, забяспечыла правядзенне шэрагу рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. Быў устаноўлены новы парадак правядзення сойма, накіраваны на звужэнне магчымасцяў зрыву яго работы. Прымяненне права liberum veto абмяжоўвалася тым, што рашэнні па эканамічных пытаннях прымаліся простай большасцю галасоў. Было рэарганізавана ўпраўленне фінансамі, дзеля чаго утвараліся скарбовыя камісіі – каронная і ВКЛ. Былі таксама скасаваны так званыя "партыкулярныя" падаткі, якія збіраліся на карысць магнатаў, і ўводзіўся генеральны падатак, які мусілі плаціць усе шляхціцы, ў каралеўскіх гарадах аднаўлялася самакіраванне.

Негледзячы на прошукі магнатэрыі, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ўвесь час свайго панавання прагягваў правядзенне палітыкі рэформ. Пры ім адбыліся новыя змены ў структуры органаў дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай. Так, сойм 1773-1775 гг. пастанавіў утварыць Пастаянную Раду, якая складалася з караля, 18 сенатараў і 18 прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Рада задумвалася як орган выканаўчай улады, што дзейнічае паміж пасяджэннямі сойма. Яна павінна была назіраць за выкананнем соймавых пастаноў, складаць законапраекты і нават разглядаць іх па даручэнні сойма. Фактычна гэты орган замяняў пастаянны ўрад Рэчы Паспалітай.

Пры падтрымцы караля праводзіліся рэформы ў прававой сферы. У гэты перыяд вялася падрыхтоўка праекта кодэкса грамадзянскага і крымінальнага права, вядомага ў гістарычнай навуцы, як кодэкс Станіслава Аўгуста. Пры Панятоўскім было прадоўжана выданне зборніка законаў, соймавых пастаноў і іншых прававых актаў пад назвай "Валюміна легум".

Станіслаў Аўгуст быў у поўным сэнсе персанажам эпохі Асветніцтва.

Адпаведныя ідэалы ён усімі сіламі намагаўся ўвасобіць у грамадскім жыцці Рэчы Паспалітай. Кароль шырока падтрымліваў асвету і адукацыю. У 1765 г. была створана афіцэрская школа-кадэцкі корпус, з якога выйшлі Тадэвуш Касцюшка, Юльян Нямцэвіч, Якуб Ясінскі. У 1773 г. была ўтворана Адукацыйная камісія, што па праву лічыцца першым у Еўропе міністэрствам адукацыі. У 1781 г. Віленская езуіцкая акадэмія была ператворана ў Галоўную школу ВКЛ.

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў таксама вядомы як мецэнат, ініцыятар выдання прагрэсіўнага часопіса "Манітор". Клапоцячыся пра прэстыж і культурная развіццё сваёй краіны, Панятоўскі садзейнічаў развіццю мастацтва і тэатра. Пры яго двары былі сабраны таленавітыя мастакі і скульптары. Развівалася будаўніцтва, прычым кароль асабіста прымаў удзел у падрыхтоўцы архітэктурных праектаў. Пры каралеўскім палацы ў Варшаве была адчынена мастацкая школа. Станіслаў Аўгуст сабраў багацейшыя калекцыі твораў мастацтва, на аснове якіх планаваў адчыніць нацыянальны музей.

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі не толькі паўплываў на правядзенне палітычных і прававых рэформ у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст., але і пакінуў след у гісторыі Беларусі як выдатны прадстаўнік эпохі Асветніцтва, рэзультаты дзейнасці каторага ён пакінуў сваім нашчадкам, дзеля будучага Беларусі.